| 4 | 5/0, 5/1, 4/2, 3/3, 2/4, 1/5, 0/6 |
| 5 | 4/0, 4/1, 3/2, 2/3, 1/4, 0/5 |
| 6 | 3/0, 3/1, 2/2, 1/3, 0/4 |
| 7 | 2/1, 2/0, 1/2, 1/1, 0/3, 0/2 или 4 исправления на месте орфограмм (пунктограмм) |
| 8 | 1/0, 0/1 или 3 исправления на месте орфограмм (пунктограмм) |
| 9 | 1 негрубая орфографическая ошибка, или 1 негрубая пунктуационная ошибка, или 1—2 исправления на месте орфограмм (пунктограмм) |
| 10 | 0/0, допускается 1—2 исправления не на месте орфограмм (пунктограмм) |

**Рекомендации учителям-предметникам:**

1. Учитывайте трудности адаптационного периода.
2. Не перегружайте учеников излишними по объему домашними заданиями.
3. Следите за темпом урока — высокий темп мешает многим детям усваивать материал.
4. Развивайте умения и навыки, учите ребят правильно учиться.
5. Никогда не используйте оценку как средство наказания ученика. Оценка достижений должна быть ориентацией на успех, способствовать развитию мотивации к учению, а не ее снижению.
6. Замечайте положительную динамику в развитии каждого отдельного ученика .
7. Развивайте навыки самоконтроля, умение оценивать свою работу и работу класса. Не бойтесь признать свои ошибки. Постоянно анализируйте все плюсы и минусы в своей работе.
8. Разнообразьте методику работы в группах, в парах, индивидуально.
9. Не создавайте психотравмирующих ситуаций при выставлении оценок за контрольные работы, за четверть и т. д., выставляйте оценки не формально, а с учетом личностных особенностей и достижений каждого ученика.

10. Наряду с оценкой чаще используйте положительные оценочные суждения («молодец, хороший ответ, справился» и т. д.).

11. В течение первого месяца (сентябрь) обучения используйте обучение без двоек.

12. Учитывайте в планировании учебной работы динамику умственной работоспособности пятиклассника в течение дня, недели.

13. Учитывайте индивидуальные психологические особенности ребенка: темперамент и связанные с ним «врабатываемость», темп, переключение, особенности внимания, двигательная активность и т. д

**Даведка па выніках вывучэння пытання "Узровень выкладання ў 5-м класе і забеспячэнне ўмоў для адаптацыі навучэнцаў да сярэдняй школы"**

**Мэта:**

1. Вызначыць ступень адаптацыі навучэнцаў 5 класаў да новых умоў адукацыйнага працэсу.
2. Прааналізаваць узровень выкладання настаўнікаў у 5 класе .

**Тэрмін правядзення:** з 09.11.2011 г. па 25.11.2011г.

**Метады і прыёмы вывучэння:** наведванне ўрокаў, праверка сшыткаў, дзённікаў; гутаркі з класным кіраўніком, настаўнікамі, навучэнцамі, аналіз анкетавання, кантрольных работ, стану здароўя; аналіз плана класнага кіраўніка

У ходзе кантролю была праведзена наступная работа:

1. Праведзена інструктыўнае пасяджэнне з класным кіраўніком, настаўнікамі-прадметнікамі па арганізацыі і ажыццяўленні кантролю
2. Наведаны і прааналізаваны ўрокі матэматыкі, англійская мовы, рускай мовы, беларускай літаратуры, гісторыі, чалавек і свет, тэхнічнай працы, фізічнай культуры і здароўя.
3. Вывучаны і прааналізаваны ліст здароўя пяцікласнікаў
4. Праверaны рабочыя і кантрольныя сшыткі па беларускай мове, матэматыцы.
5. Праверaны дзённікі навучэнцаў.
6. Праверaна выкананне адукацыйных праграм
7. Псіхолагам правядзена псіхалагічная дыягностыка пяцікласнікаў: вывучэнне ўзроўню трывожнасці, прыцязанняў, вучэбнай матывацыі. Арганізавана карэкцыйная работы з дзецьмі.
8. Прааналізавана арганізацыя работы з адоранымі навучэнцамі і арганізацыя дадатковых адукацыйных паслуг у адпаведнасці з запытамі навучэнцаў і бацькоў.
9. Педагогам-псіхолагам праведзена кансультацыя для бацькоў па праблеме адаптацыі навучэнцаў.
10. Распрацаваны метадычныя рэкамендацыі у дапамогу настаўніку, бацькам па праблеме.

Кадравае забеспячэнне спрыяе станоўчаму рашэнню пытанняў адукацыйнага працэсу. З 11 працуючых настаўнікаў 4 маюць вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю, 3-першую, 3- другую, 1 – без катэгорыі. Класны кіраўнік – Карповіч А.У. – педагог творчы і адказны.

Урокі наведваліся наместнікам дырэктара па вучэбнай рабоце Балюк С.С. Урокі настаўнікаў арганізаваны метадычна граматна, рэалізуемыя мэты адпавядаюць тэмам урокаў, тэмы ўрокаў вывучаюцца ў адпаведнасці з тэматычным планаваннем, праграма па прадметах выконваецца своечасова.

Наведванне урокаў беларускай мовы і літаратуры паказала, што настаўнік Карповіч А.У. – настаўнік другой катэгорыі – ведае псіхолага-фізіялагічныя асаблівасці навучэнцаў дадзенага ўзросту, добра валодае методыкай пабудовы ўрока, этапы ўрока добра праследжваюцца, настаўнік уключае заданні развіццёвага характару, прымяняе на ўроках розныя формы і метады навучання (даследаванне, дыялог, праблемныя пытанні). Для нармалізацыі вучэбнай нагрузкі Аксана Уладзіміраўна практыкуе рознаўзроўневыя заданні, выкарыстоўвае дыферэнцыраваныя дамашнія заданні, улічваючы індывідуальныя асаблівасці і асобасныя якасці навучэнцаў. Амаль усе навучэнцы актыўныя, арганізаваныя. Настаўнік валодае дзіцячым калектывам. Неабходна адзначыць дабразычлівасць настаўніка ў адносінах да дзяцей, карэктнасць у заўвагах і выпраўленні памылак. Аксане Уладзіміраўне з мэтай вызначэння адносін вучняў да ўрока, задаволенасці вучэбным працэсам неабходна своечасова падводзіць вынікі ўрока.

Настаўніца матэматыкі Быкоўскай А.А. (вышэйшая адукацыйная катэгорыя) валодае методыкай вядзення ўрока, ведае ўзроставыя асаблівасці пяцікласнікаў. Празнымі метадамі стымулюецца пошукавая дзейнасць, якая носіць развіццёвы характар. Тэма ўрока не аб’яўляецца настаўнікам, а вызначаецца ў выніку даследавання. Выкарыстанне настаўнікам ІКТ забяспечвае хуткую адваротную сувязь, значна павышае эфектыўнасць навучання. Настаўнік развівае навыкі кантроля і самакантроля, творчую актыўнасць пяцікласнікаў, што садзейнічае паспяховай адаптацыі навучэнцаў да ўмоў навучання ў сярэднім звяне школы. Навучэнцы на ўроку арганізаваныя, актыўныя. Настаўніку неабходна ў большай ступені звярнуць увагу на кантрольна-ацэначную дзейнасць.

На ўроку рускай мовы (настаўнік Карневіч Н.А. – вышэйшая адукацыйная катэгорыя) прымяняе разнастайныя формы і метады, што актывізуе вучняў на ўспрыманне вучэбнага матэрыялу. Такія метады работы, як тлумачэнне настаўніка, выкананне практыкаванняў, складанне практыкаванняў па схемах, гульня-фізкультхвілінка забяспечваюць рэпрадуктыўны і часткова-пошукавы характар пазнавальнай дзейнасці. Фарміруецца ў навучэнцаў навык самастойнай работы. Змена відаў дзейнасці адбываецца своечасова. Адносін паміж настаўнікам і вучнямі добразычлівыя. Дакладна спланаваны час урока. Настаўніку неабходна ў большай ступені ажыццяўляць дыферэнцыяцыю вучэбнай нагрузкі, прапаноўваць навучэнцам рознаўзроўневыя заданні з улікам узроўню навучэнцаў, індывідуальных асаблівасцей.

Урок па прадмету “Чалавек і свет” прайшоў цікава, быў насычаны разнастайнымі формамі і відамі дзейнасці. Прад’яўленне новага матэрыялу ажыццяўляецца ілюстрацыйна-дэманстрацыйным метадам. Тэмп работы аптымальны. Развіваецца лагічнае мысленне. Неабходна ў большай ступені на этапе ўспрымання і асэнсавання новай інфармацыі планаваць прыёмы і формы работы, якія забяспечваюць актыўнасць і самастойнасць мыслення навучэнцаў (стварэнне праблемных сітуацый, арганізацыя пошукавай і даследчай работы, ускладненне задач з мэтай развіцця пазнавальнай самастойнасці навучэнцаў).

Настаўнікам фізічнай культуры Сухачовым Р.Л. (вышэйшая адукацыйная катэгорыя) улічваюцца анатама-фізіялагічныя асновы фізічнай падрыхтоўкі, тлумачацца і

падкрэсліваюцца асноўныя элементы тэхнікі выканання практыкаванняў. Тлумачэнне практыкаванняў спалучаецца з паказам. Настаўнік метадычна разнастаіць паказ, што садзейнічае больш правільнаму ўяўленню аб тэхніцы практыкаванняў. Пры высокай шчыльнасці ўрока ўмела выкарыстоўваюцца паўзы для адпачынку. Настаўнік на працягу ўрока падтрымлівае мажорны тон, што садзейнічае праяўленню з боку навучэнцаў актыўнасці пры авалоданні практыкаваннямі. Раману Леанідавічу неабходна ў большай ступені каменціраваць адзнакі (адзначаць станоўчыя і адмоўныя моманты, указваць, на што звярнуць увагу).

На ўроках абслугоўваючай і тэхнічнай працы (настаўнікі першай катэгорыі Данілюк Я.І. і Бараноўскай Г.І.) змест матэрыяла адпавядаў узроўню ведаў навучэнцаў і праграме, абапіраўся на практычны вопыт вучняў, таму яны на працягу ўрока праяўлялі цікавасць да прадмета. Настаўнікамі надаецца вялікая ўвага пытанням аховы працы, акрэсліваюцца асноўныя правілы выканання практычных работ. Спрыяльны псіхалагічны клімат на ўроках ствараецца на аснове зарада станоўчых эмоцый, атрыманых навучэнцамі і настаўнікам у працэсе актыўнага ўзаемадзеяння. Выкарыстанне прэзентацыі на ўроку абслугоўваючай працы дазволіла забяспечыць камп'ютарную візуалізацыю вучэбнай інфармацыі (аб'ектаў і з'яў). Настаўнікам неабходна ў большай ступені ўлічваць узроставыя асаблівасці навучэнцаў: даваць больш дакладныя рэкамендацыі па запаўненні вынікаў назіранняў пры правядзенні лабараторнай работы, прыцягваць навучэнцаў на этапе тлумачэння да паказу правільнасці выканання тэхналагічных аперацый.

**Аналіз ліста здароўя пяцікласнікаў** дазваляе канстатаваць, што з 20 навучэнцаў 15 маюць І групу здароўя, ім медыцынскімі работнікамі рэкамендаваны лячэбна-аздараўленчы рэжым з прабываннем на свежым паветры. 3 навучэнцы маюць ІІ групу здароўя:

- 2 навучэнцы (Андрошчык Д., Друць М.) маюць захворванні органаў зроку. Ім рэкамендавана назіранне ў акуліста 2 разы на год, абмежаваная нагрузка на вочы ў вячэрні час, прабыванне на свежым паветры)
- Каскевічу К. (атлусценне І ступені) рэкамендавана назіранне ў эндакрынолага, абмежаванае ўжыванне вугляводнай ежы, прагулкі на свежым паветры

2 навучэнцы (Гаўрыла К., Ланкоўская Г.) па стану здароўя аднесены да ІІІ групы. Яны маюць дыягназы – хранічны піеланефрыт і хранічны гастрыт адпаведна. Ім рэкамендавана дыета з абмежаваннем вострай, салёнай ежы. Назіранне 2 разы на год ва ўрача, прагулкі на свежым паветры.

Каскевічу К., Гаўрыла К., Ланкоўскай Г. рэкамендаваны заняткі ў падрыхтоўчай групе па фізічнай культуры, але вучні не маюць медыцынскіх даведак аб стане здароўя, зацверджаных медыцынскай камісіяй.

**Праверка кантрольных і рабочых сшыткаў** па беларускай мове і матэматыцы. (Карты-схемы па праверцы сшыткаў прыкладаюцца) паказала, што захоўваюцца адзіныя патрабаванні да афармлення сшыткаў. Сшыткі навучэнцаў 5 класа правяраюцца кожны дзень, яны ў добрым стане. Большасцю навучэнцаў выконваюцца патрабаванні адзінага арфаграфічнага рэжыму: наяўнасць даты, тэмы, палёў, адступаў, работа над памылкамі. Аб'ём класных і дамашніх дамашніх заданняў вытрыманы, адпавядае норме для навучэнцаў 5 класа. Аднак настаўнікам неабходна звярнуць увагу на каліграфію, памылкі

пры афармленні надпісу на вокладцы, пры напісанні даты, падціранні ў асобных вучняў: Буйка В., Сакалоўскай Г., Хаміцкага А., Гуляя Д., Камінскага С., Каскевіча К.

Аналіз выканання адукацыйных праграм паказаў, што ўсімі настаўнікамі-прадметнікамі праграмны матэрыял вывучаецца своечасова і ў поўным аб'ёме.

Прааналізавана арганізацыя работы з адоранымі навучэнцамі і арганізацыя дадатковых адукацыйных паслуг у адпаведнасці з запытамі навучэнцаў і бацькоў: факультатыў па англійскай мове "Практыкум па чытанні" наведвае 7 навучэнцаў, факультатыў па польскай мове – 8. 16 вучняў класа наведваюць гадзіну футбола, 9 - платныя заняткі па матэматыцы. Праводзіцца індывідуальная работа па падрыхтоўцы навучэнцаў да ўдзелу ў алімпіядах па беларускай мове і матэматыцы.

**Псіхалагічная дыягностыка пяцікласнікаў: вывучэнне ўзроўню трывожнасці, прыцязанняў, вучэбнай матывацыі.**

Аналіз адказаў навучэнцаў на пытанні тэста Філіпса дазволіў размеркаваць іх па ўзроўнях трывожнасці наступных фактараў:

- агульная трывожнасць у школе:
  1-ы ўзровень (трывожнасць меньш 50%) – 60% (12 навучэнцаў)
  2-і ўзровень (трывожнасць больш 50%, але меньш 75%) – 15% (3 навучэнца)
  3-і ўзровень (трывожнасць больш 75%) – 25% (5 навучэнцаў)
- перажыванне сацыяльнага стрэсу:
  1-ы ўзровень – 50% (10 навучэнцаў)
  2-і ўзровень – 50% (10 навучэнцаў)
- фрустрацыя патрэбнасці ў дасягненні поспеху:
  1-ы ўзровень – 85% (17 навучэнцаў)
  2-і узровень – 10% (2 навучэнца)
  3-і ўзровень – 5% (1 навучэнец)
- страх самавыражэння
  1-ы ўзровень – 40% (8 навучэнцаў)
  2-і ўзровень – 15% (3 навучэнца)
  3-і ўзровень – 45% (9 навучэнцаў)
- страх сітуацыі праверкі ведаў:
  1-ы ўзровень – 35% (7 навучэнцаў)
  2-і ўзровень – 15% (3 навучэнца)
  3-і ўзровень – 55% (11 навучэнцаў)
- страх неадпаведнасці:
  1-ы ўзровень – 45% (9 навучэнцаў)
  2-і ўзровень – 50% (10 навучэнцаў)
  3-і ўзровень – 5% (1 навучэнец)
- нізкая фізіялагічная супраціўляльнасць стрэсу:
  1-ы ўзровень – 70% (14 навучэнцаў)
  2-і ўзровень – 15% (3 навучэнца)
  3-і ўзровень – 15% (3 навучэнца)
- праблемы і страхі ў адносінах з настаўнікамі:
  1-ы ўзровень – 70% (14 навучэнцаў)
  2-і ўзровень – 10% (2 навучэнца)

3-і ўзровень – 20% (4 навучэнца)

Вызначэнне ўзроўню прыцязанняў на аснове выканання навучэнцамі заданняў методыкі Шварцландэра дазволіла зрабіць наступныя вывады:

- нерэалістычна высокі ўзровень прыцязанняў – 5% (1 навучэнец);
- высокі ўзровень прыцязанняў – 25% (5 навучэнцаў);
- умераны ўзровень прыцязанняў – 50% (10 навучэнцаў);
- нізкі ўзровень прыцязанняў - 20% (4 навучэнца)

Сацыяметрычнае даследаванне дазволіла зрабіць наступныя вывады:

- "зоркі" – 4 навучэнца (20%)
- "папулярныя" – 9 навучэнцаў (45%)
- "мала папулярныя" – 4 навучэнца (20%)
- "ізгоі" – 3 навучэнца (15%)

Вызначэнне ўзроўню вучэбнай матывацыі на аснове анкетавання навучэнцаў (М.С.Лусканавай), дазволіла зрабіць наступныя вывады:

- высокая школьная матывацыя – 1 навучэнец (5%)
- нармальная школьная матывацыя – 4 навучэнца (20%
- станоўчыя адносіны да школы, якая прываблівае больш пазаўрочнымі бакамі – 7 навучэнцаў (35%)
- нізкая школьная матывацыя – 5 навучэнцаў (25%)
- негатыўныя адносіны да школы – 3 навучэнца (15%)

Такім чынам, атрыманыя даныя дазваляюць зрабіць вывады аб сацыяльна-псіхалагічнай адаптацыі да навучання ў сярэднім звяне ў навучэнцаў 5 класа. Так, 65% навучэнцаў (13) знаходзяцца ў зоне адаптацыі, 15% (3 навучэнца) – у зоне магчымай дэзадаптацыі, 20% (4 навучэнца) – у зоне дэзадаптацыі.

РЭКАМЕНДАЦЫІ:

1. Намесніку дырэктара па вучэбнай рабоце правесці псіхолага-педагагічны кансіліум з мэтай азнаямлення з асноўнымі задачамі і цяжкасцямі першаснай адаптацыі для выпрацоўкі агульных патрабаванняў да пяцікласнікаў

   Студзень 2012

2. Настаўнікам-прадметнікам:

2.1. Ажыццяўляць рознаўзроўневае навучанне для павышэння якасці ведаў; прадумваць работу са слабапаспяваючымі навучэнцамі класа, аказваць ім дапамогу для развіцця іх здольнасцей і фарміравання станоўчай матывацыі да навучання.

   Пастаянна

2.2. Накіраваць намаганні на канструяванне ўрока з улікам узроставых і індывідуальных асаблівасцей навучэнцаў, на арганізацыю самастойнай работы і прывіццё навыкаў такой работы.

   Пастаянна

2.3. Праводзіць карэкцыю ведаў навучэнцаў, улічваючы фізіялагічныя, інтэлектуальныя якасці, вынікі анкетавання.

   Пастаянна

2.4. Праводзіць работу па павышэнні каліграфіі пісьма.

   Пастаянна

2.5. Наведаць урокі ў выпускным класе пачатковай школы з мэтай азнаямлення з тэхналогіяй навучання ў пачатковай школе, формамі і метадамі арганізацыі вучэбнай дзейнасці.

Студзень 2012

3. Класнаму кіраўніку:

3.1. Правесці цыкл класных гадзін, накіраваных на засваенне новага стыля зносін з дарослымі і аднагодкамі, рэгуляцыі асабістага стану, выпрацоўцы эфектыўных прыёмаў арганізацыі вучэбнай дзейнасці (“Вучымся планаваць сваю дзейнасць”, “Памылкі ў арганізацыі свайго часу”, “Як рыхтаваць дамашняе заданне?” і інш.)

Студзень – люты 2012

3.2. Арганізаваць наведванне сем’яў з мэтай вывучэння рэжыма дня дзяцей.

Студзень – люты 2012

4. Педагогу-псіхолагу:

4.1. Арганізаваць аказанне кансультацыйнай дапамогі бацькам, дзеці якіх адчуваюць цяжкасці ў прыстасаванні да навучання ў сярэднім звяне школы.

На працягу года

4.2. Правесці цыкл развіваючых заняткаў з навучэнцамі 5-га класа “Як пасябраваць са школай”, накіраваных на прафілактыку школьнай дэзадаптацыі, развіццё кагнітыўнай, эмацыянальна-асобаснай і матывацыйна-валявых сфер.

Студзень

4.3. Правесці цыкл карэкцыйных заняткаў з навучэнцамі 5-га класа, накіраваных на інтэграцыю адрынутых.

Студзень – люты 2012

4.4. Стварыць банк даных на дзяцей групы адаптацыйнай рызыкі з мэтай уключэння іх у карэкцыйна-развіваючыя праграмы

Студзень 2012

4.5. Правесці паўторную дыягностыку адаптаванасці навучэнцаў 5-га класа з мэтай адследжвання эфектыўнасці псіхолага-педагагічнага суправаджэння

Красавік 2012

## Тэма. Правапіс прыставак на зычны ( 5 клас)

Мэта : - узнавіць веды навучэнцаў аб прыстаўцы;
-паўтарыць зычныя гукі, іх класіфікацыю;
- выявіць веды навучэнцаў па дадзенай тэме і пашырыць іх;
-фарміраваць устойлівыя навыкі правапісу прыставак; выпрацоўваць адпаведныя арфаэпічныя навыкі;
- арганізаваць кантроль засваення тэмы;
- развіваць арфаграфічную пільнасць, самастойнасць і маўленчыя навыкі;
- выхоўваць цікавасць да вывучэння роднай мовы.

Тып урока : тлумачэнне новага матэрыялу
Абсталяванне : “ Беларуская мова” падручнік для 5 класа, карткі, мультымедыйная прэзентацыя, каляровыя маркеры.

Ход урока

*I.Арганізацыйна – матывацыйны этап.*

1. Стварэнне эмацыянальнага настрою. Прыём інтэрактыўнай тэхналогіі “Люстэрка”. Вучні разам з настаўнікам усміхаюцца ў люстэрка, кажуць свайму адлюстраванню некалькі кампліментаў, пасля – свайму суседу па парце.

2. “Арфаграфічная хвілінка”.
На дошцы запісаны словы з прапушчанымі літарамі. Неабходна ўставіць літары і растлумачыць правапіс слоў.
Пазелянец, зеленаватаму, герой, Прыпяць, васямнаццаць, заяц.
**Успомнім** ( калектыўна): - Да якіх часцін мовы належаць дадзеныя словы?
- Назавіце ўласны назоўнік( Прыпяць).
- Назавіце граматычныя формы слова *зеленаватаму*
*( адз. лік, м. род, Д. скл. ).*

*II. Падрыхтоўка да ўспрымання новай тэмы ўрока.*

На слайдзе зроблены незразумелы запіс: ( слайд №2)

“ Пр в п с пр ст в к н з чн ”
а а і ы а а а ы

Настаўнік. Тэма нашага ўрока…( звяртаецца да слайда). Я не магу прачытаць тэму. Можа ў вас атрымаецца? Што здарылася са словамі? ( З запісу тэмы ўрока выпалі галосныя літары, а прачытаць слова толькі па зычных нельга. Трэба галосныя з ніжняга рада ўставіць па чарзе ў запіс на месцах пропускаў. Тэма ўрока – “ Правапіс прыставак на зычны”( слайд №3)).

- Абапіраючыся на дадзеныя дзеясловы пастарайцеся вызначыць задачы ўрока:

**успомніць**, што такое прыстаўка;
**паўтарыць** зычныя гукі і іх віды;
**даведацца** пра правапіс прыставак на зычны;
**навучыцца** правільна пісаць і вымаўляць словы з гэтымі прыстаўкамі;
**пашырыць** свае веды па дадзенай тэме. ( слайд № 4)

Натаўнік. Урок можна будзе лічыць паспяховым, калі напрыканцы яго мы зможам адказаць на наступныя пытанні і выканаць тэставыя заданні, карткі з якімі знаходзяцца на вашых партах.

1. У якіх прыстаўках зычныя пішуцца нязменна?
2. Раскажыце аб правапісе прыставак на з-, с-.
3. Ад чаго залежыць правапіс прыставак на зычны?

***Паўтарэнне пройдзенага матэрыялу.***

Настаўнік. А зараз давайце ўспомнім, што вывучае Марфеміка? ( раздзел навукі пра мову, у якім вывучаецца будова, марфемная структура слова).Паглядзіце, калі ласка, на экран. Ці знаёмы вам гэтыя знакі? Што яны абазначаюць?( на слайдзе № 5 паказваецца графічнае абазначэнне кораня, прыстаўкі, суфікса, асновы, канчатка, постфікса).

Праца па варыянтах. Разабраць словы па саставе.
1 варыянт. Ручка, новенькі, лімонны.

2 варыянт. Бясстрашны, пень, адвячорак.
3 варыянт. Бессаромны, трактарыст, пралеска.

**Настаўнік.**– А зараз давайце звернемся да Фанетыкі. Скажыце, калі ласка, што вывучае Фанетыка?

- Якія гукі называюцца галоснымі? Зычнымі?

1. Праца ў групах

**2. Запоўніць табліцу**

Б, в, г, д, дж, дз, п, ж, з, с, х, й, к, ф, л, м, н, р, ў, т, ц, ч, ш.

| | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Звонкія | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| Глухія | | | | | | | | | | | | | | | | | | |

**2. Падкрэсліць словы, у якіх гукаў больш чым літар.**

Мільён, зямля, з'ява, армія, вайна, Янка.

3. Запішыце словы дождж, яе ў транскрыпцыі. Вызначце колькасць складоў, гукаў, літар. Зрабіце фанетычны разбор слова дзень.

Дождж -
Яе –
Дзень -

( Рабяты працуюць у групах, у склад якіх уваходзяць дзеці з розным узроўнем ведаў. Адзін з навучэнцаў у кожнай групе выконвае ролю кансультанта. ).

2.Праверка работ

( Групы мяняюцца работамі. На слайдзе паказваюцца правільныя адказы, навучэнцы звяраюць запісы. Кансультант ацэньвае правільнасць выканання задання чужой групы і актыўнасць ўдзельнікаў сваёй групы). ( слайды № 6,7,8)

**Фізкультхвілінка.**

**1.**Карэкцыя зроку.

2. А зараз, дзеці, дружна ўсталі,
Хутка рукі ўверх паднялі.
Да сонца пацягнуліся, сонцу ўсміхнуліся.
Промні засвяцілі – рукі апусцілі.
Крок на месцы – раз, два, тры!
Плечы добра разагні.
Правядзём адну гульню:
Усе прысядзем, скажам: "у".
Хутка ўстанем, скажам : " о".
Працаваць пара даўно.

*III. Тлумачэнне новага матэрыялу.*

1. Калектыўная вусная праца з падручнікам практ. 217( стар. 119).
2. Самастойнае чытанне тэарэтычнага матэрыялу падручніка( раскажы суседу па парце).
3. Складанне алгарытма( заданне для мацнейшых навучэнцаў). На аснове тэарэтычнага матэрыялу падручніка скласці алгарытм " Правапіс прыставак на зычны. Агучванне .

4. Агучванне настаўнікам апорнага канспекта ( на слайдах № 9, 10).
**Запомні**

1.**д** ( прыстаўка) + **д** = а<u>дд</u>аць

**б** ( прыстаўка) + **б** = а<u>бб</u>егчы

**з** ( прыстаўка) + **з** = ра<u>зз</u>лавацца

**с** ( прыстаўка) + **с** = бя<u>сс</u>прэчны

**<u>Выключэнні:</u>расол, расольнік, расада, расаднік, ростань.**

5. Пераклад з рускай на беларускую мову. Што вы заўважылі?
Зняць, збіць - снять, сбить.
Скінуць, схадзіць – скинуть, сходить. ( У руск. мове прыстаўкі з няма).

*IV. Замацаванне.*

1. Калектыўная праца Практ .218( вусна).
2. Самастойная праца ( заданне на картках).

А) Прачытайце тэкст, вызначце тэму і асноўную думку. Выпішыце словы з прапушчанымі літарамі, устаўце літары, патлумачце правапіс.

22 чэрвеня 1941 годапачаласяадназсамыхкрывавыхі ( без, бяз, бес, бяс)літасныхвойнаў. Янара..бурылаўсемірныяпланы, навісланадкожнайхатай. Бя..страшназмагаўсязворагамнашнарод. Кожнычацвёртыбеларуса..даўсваёжыццёзасветлаебудучае, замірнаенебанаднамі. Іхподзвігніколінебудзезабыты.

Б) Самаправеркапаключы ( наслайдзе№ 11).

3. Гульня “ Карэктар”. Выправіць памылкі ў словах.( Словы запісаны на дошцы).
Жжаць, рашшыць, расзбраенне, узтрывожыцца, бясстрашны, атказаць, безвоблачны.

4. .Праца ў групах.
<u>1і 2 група –</u> Практ. 223 ( 1 гр. – 7 сказ, 2 група – 3 сказ)
<u>3 група.</u> Размясціце сказы ў правільным парадку, каб атрымалася віншаванне ветэранам з надыходзячым святам Перамогі.
1.Паважаныя ветэраны! 2. Жадаем усім шчасця, здароўя, даўгалецця. 3. Вы бясстрашна як адзін узняліся на бязлітасную барацьбу з лютым ворагам. 4. На вашу долю выпалі бесчалавечыя цяжкасці і выпрабаванні, але вы выстаялі і перамаглі. 6. Вы зберaглі для нас мір на зямлі. 5. Многія з вас аддалі сваё жыццё за наша шчаслівае дзяцінства.7. Сардэчна віншуем вас з надыходзячым святам – Днём Перамогі. (1, 4,3, 6, 5,7,2).

V. Падвядзенне вынікаў урока.

1. Кантрольна-ацэначны тэст.
1.Адзначце словы, у якіх у прыстаўцы пішацца літара З?
а) ра.. любіць
б) бя..радасны
в) ра..казаць

г) ра..сыпаць

2. Адзначце словы, у якіх узнікае падвоенае З або С?

а) бя..зубы

б) ра..сольнік

в) бе..зямельны

г) ра..капаць

3. У якіх словах дапушчаны памылкі?

а) расдаць

б) атбіць

в) развесяліцца

г) раскідаць

Узаемаправерка па ключы ( на слайдзе №12).

1 – а,б

2- а,в

3- а,б

Аналіз вынікаў тэста. Рэкамендацыі тым, у каго дапушчаныя памылкі.

VI. Рэфлексія.

- Успомніце, якія задачы мы ставілі перад сабой на пачатку ўрока. Ці вырашылі мы іх? ( Зварот да задач урока. Задачы паказваюцца на слайдзе №13).
- Давайце паспрабуем адказаць на пастаўленыя ў пачатку ўрока пытанні.

( Калі навучэнцы адказваюць правільна , настаўнік чырвоным колерам абводзіць першую літару пытання).

**1.У**якіх прыстаўках зычныя пішуцца нязменна?

**2.Р**аскажыце аб правапісе прыставак на з-, с-.

**3.А**д чаго залежыць правапіс прыставак на зычны?

**-** Якое слова атрымалася з чырвоных літар? Гэта значыць, што наш урок прайшоў нездарма.

Невялікае творчае заданне групам: скласці сінквейн.

| 1і2 групы . | 3і4 групы ( мацнейшыя вучні) |
|---|---|
| **Урок** | **Прыстаўка** |
| Цікавы, змястоўны. | На зычны, на галосны. |
| Вабіць, вучыць, займае. | Утварае, пераўтварае, змяняе. |
| Урок прайшоў вельмі цікава. | Прыстаўка служыць для ўтварэння слоў. |
| Веды. | Марфема. |

VII. Выстаўленне і каменціраванне адзнак

VIII. Дамашняе заданне ( на выбар) ( Слайд №14).

1. Практ. 221( 1-4б.)
2. Практ.222( 5-6 б.)
3. Падрыхтаваць слоўнікавы дыктант на вывучанае правіла ( 15 слоў)- (7-8 б.)
4. Выпісаць з падручніка па літаратуры прыказкі са словамі на вывучанае правіла ( 9-10 б.).

## Урок беларускай мовы (4кл)

## Тэма: "Напісанне асабовых канчаткаў дзеясловаў 1 і 2 спражэння. Замацаванне"

Мэта: замацаванне вучнямі ведаў аб змяненні дзеясловаў 1і 2 спражэння па асобах;

садзейнічаць развіццю ўмення ўжываць дзеясловы 1 і 2 спражэння і правільна пісаць іх канчаткі, развіццю маўлення вучняў;

стварацць ўмовы для выхавання цікавасці да кнігі.

Абсталяванне: карткі – заданні для груп, мультымедыйная прэзентацыя, тэставыя заданні

Ход урока:

**1. Аргмомант.**

Залатое цуда –сонца!

Загляні да нас у ваконца!

Нам здароўе зберажы,

І вучыцца памажы!

Перадайце, калі ласка, цяпло, якое пасылае нам сонейка, сваім сябрам –аднакласнікам і пажадайце ім поспехаў на ўроку.

А на пачатку нашага ўрока прапаную вам адгадаць загадку.

Белае поле, чорнае насенне, хто яго сее, той разумее. (Кніга)

- Якое значэнне мае кніга ў жыцці чалавека?
  Немагчыма ўявіць сабе жыцце без вернага сябра – добрай кнігі.У свеце існуе мноства кніг – і маленькіх, і вялікіх. Кожная з іх адкрывае нам шлях у свет ведаў. Кнігі расказваюць нам аб жыцці , аб працы людзей, аб мінулым і сучасным нашай Радзімы, аб вядомых людзях і многім-многім іншым.
  Менавіта таму, што значэнне кнігі для чалавека вельмі вялікае і для таго, каб яшчэ раз прыцягнуць увагу людзей да кнігі, 2012 год быў аб'яўлены годам кнігі.
- Хто стварае для нас кнігі?
- Што патрэбна ведаць і умець, каб стаць пісьменнікам ці паэтам?

У першую чаргу патрэбна дасканала ведаць сваю родную мову, спасцігнуць усе яе таямніцы. Вывучэннем чарговых таямніц нашай мовы мы займемся на нашым уроку.

Ацэньваць свае веды будзеце ў лістах самаацэнкі.

**2.Праверка дамашняга задання.**

а)Выкананне тэставых заданняў за камп’ютарам. (5 чалавек).

б) Гульня “Засялі дзеясловы”.(1 вучань працуе каля дошкі, асататнія за партай).

На дошцы выявы домікаў . Парпанаваныя дзеясловы патрэбна размеркаваць па тыпу спражэння.

Косіць, чытаю, спяваюць,намалюеш, маўчаць, танцуем, спіць, адпачываеце, свецім, грымяць.

в)Складанне кластэра па тэме “Дзеяслоў”

г) Праверка правільнасці выканання заданняў.

**3. Хвілінка чыстапісання.**

Паглядзіце на партрэты гэтых людзей. Ці вядомыя вам гэтыя людзі? (Францыск Скарыны, Сымон Будны).Што вы ведаеце пра іх?

Менавіта яны прынеслі нам спалучэнні літар для хвілінкі чыстапісання і будуць сачыць за тым, як правільна і прыгожа вы іх прапішаце.

(Вучні прапісваюць спалучэнні літар С,Ф,Б і імены і прозвішчы асветнікаў, са слоў складваюць і запісваюць сказ).

Выдаў, Скарына, друкаваную, Францыск, кнігу, першую.

Заданні:

- Разбярыце сказ па членах сказа.
- Знайдзіце ў сказе словы, у якіх колькасць гукаў і літар не супадае. Растлумачце, чаму.
- Назавіце дзеяслоў, вызначце яго час. Якія яшчэ граматычныя катэгорыі мы можам вызначыць у гэтага дзеяслова?
- Пастаўце гэты дзеяслоў у форме цяперашняга часу, выдзеліце канчатак і лік.
- Для чаго патрэбна ведаць асабовыя канчаткі дзеясловаў?

**4.Работа над тэмай урока**

4.1.Сумеснае вызначэнне тэмы і задач урока.

4.2. Работа ў групах (падзел на групы адбываецца па колеры жэтонаў, якія ляжаць у дзяцей на партах).

Дзве групы працуюць у ролі даследчыкаў:

1 група – спрагае дзеяслоў **чытаць** і вызначае памылканебяспечныя канчаткі дзеяслова 1 спражэння;

2 група – спрагае дзеяслоў **гаварыць** і вызначае памылканебяспечныя канчаткі дзеясловаў 2 спражэння;

3 група – да  прапанаваных дзеясловаў падбірае дзеясловы з супрацьлеглым значэннем, вызначае час, асобу і лік дзеясловаў – антонімаў,выдзяляе канчаткі.

Гаворыць –

Забудзеце –

Шэпчуць –

Зачыні –

Радуюся –

Знайшоў –

4.3. Прэзентацыя работы груп.

4.4. Фізкультхвілінка.

4.5.Рознаўзроўневыя заданні.(Кожны вучань выбірае заданне для выканання).

3 узровень – выкананне заданняў за камп'ютарам.

4 узровень – пр.138

5 узровень – пр. 138 (3 сказы)

4.6. Самаправерка па ключы.

4.7. Хвілінка творчасці. (Работа ў групах)

1 група – скласці тэкст "Прыгажуня – вясна"

2 група – прыдумаць загадку пра кнігу.

3 група – скласці сінквейн на тэму "Дзеяслоў"

4.8. Прэзентацыя работы груп.

**5. Падвядзенне вынікаў урока**

5.1. Наш урок завяршаецца. Мы шмат чаго зрабілі. Свае веды мы будзем удасканальваць на наступных уроках. Але мяне радуе тое, што вы маеце ўжо дастаткова трывалую базу, якая вам дапаможа паспяхова засвойваць вучэбны матэрыял у 5 і наступных класах сярэдняй школы.

5.2. Д/з (на выбар)

а) пр. 141;

б)з любога літаратурнага твора выпісаць 5 дзеясловаў 1 спражэння і 5 дзеясловаў 2 спражэння. Выдзеліць канчаткі, вызначыць лік і асобу.

5.3. Запаўненне лістоў самаацэнкі. Выстаўленне адзнак.

5.4. Рэфлексія "Методыка незакончаных сказаў"

Сёння на ўроку я даведаўся…

Мне спадабалася…

Я зразумеў, што…

Мне было цяжка…

Я хацеў бы…

**Тема:Правописание безударных гласных в личных окончаниях глаголов**

**Класс: 5**

**Учитель:** Карневич Н.А.

**Цель** урока: ознакомить учащихся с правилом написания безударных личных окончаний глаголов; формировать навык правильного написания безударных гласных в личных окончаниях глаголов; развивать умение восстанавливать ранее изученный материал и пользоваться им в новой обстановке; воспитывать интерес к языку.

**Эпиграф:**

**В** первом спряжении пишут, поют,

Пашут поля и железо куют.

И во втором никогда не грустят!

Мчатся в музеи, учиться спешат.

**Ход урока**

**I. Организационный момент**

**II. Проверка домашнего задания**

Упр. 134 (выполняется двумя учениками на доске: 1-й — 1, 2 предложения, 2-й — 3, 4.)

**III. Лингвистическая разминка**

Заменить фразеологизм глаголом-синонимом с *-ться.* Записать глаголы и объяснить их написание.

*Совать нос (интересоваться), надуть губы (обидеться), дрожать как осиновый лист (бояться), бежать со всех ног (нестись), распускать руки (драться), повесить голову (расстроиться).*

— В какой форме стоят глаголы? *(В неопределенной форме.)*

— Что нужно помнить об их правописании? (Они *пишутся с Ь.)*

**IV.** Изучение **нового материла**

1. Чтение сказки учителем. Учащиеся должны определить тему урока.

**Сказка о Царе Глаголе и его сыновьях**

Давным-давно, когда нас с тобой еще не было на свете, в царстве Грамматика жил-был славный царь Глагол со своим глагольным людом. Народ его был трудолюбивым, деятельным: все время куда-то спешил, что-то делал, чем-то занимался.

Было у царя два сына: I спряжение и II спряжение. Призвал однажды царь Глагол сыновей и стал говорить им:

— Стар я стал, дети мои, трудно мне управлять государством. Пришло время вам заменить меня. Даю вам три дня и три ночи, чтобы вы решили, как вам царствовать.

Думали они три дня и три ночи и решили: II спряжение будет править теми глаголами, которые в неопределенной форме заканчиваются на *-ить,* а I спряжение — всеми остальными. Пришли Сыновья к отцу и сказали о своем решении. Глагол обрадовался, что у него такие мудрые сыновья, и издал указ о разделении государства.

— Но это еще не конец сказки...

2. Учащиеся определяют тему урока, формулируют цели.

3. Записывают эпиграф. Объясняют написание *-ться.* Выделяют окончания глаголов.

— Почему есть разница в написании окончаний?

4. Упр. 136, II (устно).

— Какая гласная пишется в личных окончаниях глаголов I и II спряжения?

— Как определить спряжение?

5. Составление опорной схемы.

— Но дослушайте нашу сказку до конца. Какой еще вывод необходимо сделать?

...Вы помните, что король издал указ о разделении государства. Образовалось два государства. Разлетелись гонцы во все концы государства с этой вестью. Но не всех она обрадовала. Одна семья после этого раздела оказалась в разных царствах. Это были глаголы: ГНАТЬ, ДЕРЖАТЬ, СМОТРЕТЬ, ВИДЕТЬ, ДЫШАТЬ, СЛЫШАТЬ, НЕНАВИДЕТЬ, ЗАВИСЕТЬ, ВЕРТЕТЬ, ОБИДЕТЬ, ТЕРПЕТЬ. Пришли они к царю с просьбой:

— Милостивый государь, славный царь Глагол, помоги нам.

— Что случилось?

— По твоему указу оказались мы в царстве I спряжения, а наши старые родители — в царстве II спряжения. Разреши нам остаться с ними.

— Рад бы вам помочь, но не могу нарушить свой указ.

— Смилуйся, государь, сделай исключение.

Не смог устоять царь перед просьбой и разрешил этим глаголам остаться в царстве II спряжения, хотя они и не заканчиваются на -ить. И по сей день эти глаголы в виде исключения относятся ко II спряжению. Запомните их, ребята!

6. Работа со словами-исключениями (с. 74, в рамочке; дополнение схемы).

Слова можно запомнить с помощью веселых рифм, которые используются в качестве **физкультминутки.**

Как начнешь меня ты **гнать,**

Перестану я **дышать,**

Перестанут уши **слышать,**

Ну а руки все **держать,**

На меня начнешь **смотреть,**

Будешь ты меня **вертеть,**

Буду все равно **терпеть,**

Буду от тебя **зависеть,**

Раз ты мог меня **обидеть,**

Буду я тебя **не видеть,**

А открыто **ненавидеть.**

**V. Закрепление изученного материла**

1. Речевая разминка (с грамматическим заданием).

Зачем любить и ненавидеть?

Растить цветы и звезды видеть?

Зачем терять, зачем искать.

Зачем о прошлом вспоминать?

Зачем живые все живут,

В чем смысл жизни заключен?

В чем заключен ее закон?

И не дает покоя мне,

Моей недетской голове

Один — единственный вопрос:

Зачем родился я и рос?

— Какие предложения по цели высказывания представлены в стихотворении?

— Как их нужно читать?

— Прочитайте стихотворение.

— Найдите глаголы в неопределенной форме, определите их спряжение (по образцу в упр. 137).

2. Упр. 138. Комментированное письмо («по цепочке»).

3. Анализ предложения (работа у доски.)

Наступает поздняя осень. Сегодня дует резкий ветер, кружатся в воздухе разноцветные листья.

— Дать устную характеристику предложениям. Построить схему 2-го предложения.

— Подчеркнуть грамматические основы.

— Объяснить написание окончаний глаголов, *-тся.*

4. Работа над упр. 140 (1). Выписать из предложений грамматические основы (они подчеркнуты), определить, чем выражены главные члены.

5. Чтение правила на с. 76.

**VI. Расширение знаний о грамматической основе предложения и пунктуации**

**а)** Устная работа над упр. 140.

— Провести наблюдение над грамматическими основами (подчеркнуть в тексте), определить, чем выражены главные члены.

**б)** Творческий диктант.

— Составить предложение из 3-х слов, ответив на вопросы. Образец — пример в материале на с. 76.

— Подчеркнуть грамматические основы, объяснить пунктуацию.

**VII. Подведение итогов урока.**

**Рефлексия «Алфавит»**

— Подберите слова на заданную букву: один глагол I спряжения, 2-й — II спряжения.

Например: *М — моет (I спр.), мычит, (II спр.) и т. д.*

— По итогам проделанной работы оцените свою работу на уроке и попробуйте определить степень усвоения вами материала.

**VIII. Домашнее задание**

§ 22, упр. 139, вопросы на с. 76—77.

Использованная литература

1. Учебные программы для общеобразовательных учреждений с русским языком обучения. 1 – 4 классы. – М : Просвещение, 2009.

2. Учебные программы для общеобразовательных учреждений с русским языком обучения. 5 класс.

3. Грабчикова Е.С. Русский язык: учебник для 4 кл. общеобразовательных учреждений с русским языком обучения. В 2 ч. /Е.С.Грабчикова, Н.Н.Максимук. – Минск : Нац. ин-т образования, 2008.

4. Мурина А.А. Русский язык: учебник для 5 кл. общеобразовательных учреждений с русским языком обучения. В 2 ч. /А.А.Мурина, Ф.М.Литвинко, Г.И.Николаенко.

5. Миллер О.М. Диагностика готовности младших школьников к переходу в среднюю школу /О.М.Миллер, Т.Л.Ядрышникова. – Красноярск, 1991.

6. Львов М.Р. Преемственность и перспективность в обучении русскому языку /под ред. В.В.Бабайцевой, Г.К.Лидман-Орловой. – М., 1979.

7. Пачатковае навучанне. – 2009. - № 1.

8. Начальная школа. – 1999. - № 2

9. Начальная школа. – 2000. - № 12.

10. Вучэбныя праграмы для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання 1-4 класы. – Нацыянальны інстытут адукацыі, 2010.

11. Вучэбная праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання 5 клас. – Нацыянальны інстытут адукацыі, 2010.

12. Пачатковае навучанне. – 2009. - № 1.

13. Начальная школа. – 1999. - № 2

14. Начальная школа. – 2000. - № 12.